# СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ПАЛЕМІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

- **У апошняе дзесяцігоддзе XVIст. у літаратуры Беларусі пачынаецца актыўная *палеміка* вакол *мэтаў і прынцыпаў* аб'яднання *Праваслаўнай царквы* і Каталіцкага касцёла.**
- **Яна прадстаўлена 2 кірункамі палемічнай думкі: уніяцкім і праваслаўным**

# Уніяцкі кірунак палемічнай думкі прадстаўлены творамі:

- Іпацiя Пацея,
- Пятра Скаргі,
- Язэпа Руцкага.

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ



- Сапраўднае імя – **Адам Львовіч Пацей;**
- пісьменнік, філосаф, багаслоў, другі уніяцкі мітрапаліт;
- Гады жыцця:

  1541 -1613

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ

пакінуў вельмі багатую літаратурную спадчыну:

- **два белетрызаваныя творы:** **«Справядлівае апісанне ўчынку і справы сінодавай і Абароны здзейсненых згоды і лучнасці, якія сталіся на сінодзе Берасцейскім у 1596 годзе» (Вільня, 1597) і «Рэляцыя» (Вільня, 1609);**
- **корпус таленавітых публіцыстычных тэкстаў:** **«Унія, або Выклад галоўных артыкулаў лучнасці грэкаў з Касцёлам Рымскім», «Адказ на ліст нейкага безымяннага Клірыка Астрожскага», «Адказ на ліст Мялецця, александрыйскага патрыярха», «Антырызіс, або Апалогія супраць Крыштофа Філалета», «Размова Берасцяніна з Братчыкам», «Абарона сабору Фларэнційскага восьмага», «Правы і прывілеі нададзеныя ад каралёў польскіх», «Гармонія, або Згода веры, сакраментаў і цырымоній святой Усходняй Царквы з Касцёлам Рымскім», «Ерасі, невуцтва і палітыка папоў ды мяшчан брацтва Віленскага».**
- **значную эпісталаграфічную спадчыну:** **«Ліст да Крыштофа Радзівіла, віленскага ваяводы», «Ліст да Міхаіла Рагозы», лісты да князя Канстанціна Астрожскага, «Пасланне да слуцкага святарства», «Ліст да праваслаўных» і інш.**
- **Ён аўтар зборніка ўрачыстых пропаведзяў (74 казанні і гамілії).**

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ

- Нарадзіўся на Берасцейшчыне ў шляхецкай сям’і.
- Бацька, Леў Пацей, служыў найвышэйшым пісарам Жыгімонта I Старога, а таксама займаў адказную пасаду падскарбія (міністра фінансаў) ВКЛ.
- Пачатковую адукацыі атрымаў у Нясвіжскай пратэстанцкай школе.
- Затым у Кракаўскі універсітэце на факультэце свабодных мастацтваў.
- Па вяртанні на радзіму служыў да 1572 г. пры двары Жыгімонта II Аўгуста.

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ

- У 33-гадовым узросце пакінуў кальвінскае веравызнанне і вярнуўся ў праваслаўе.
- Па смерці жонкі пакідае свецкае жыццё і пастрыгаецца ў манахі пад імем Іпаці.
- Увесну 1593 г. атрымлівае духоўнае пасвячэнне і прывілей манарха на займанне пасады Ўладзіміра-Берасцейскага епіскапа.
- У якасці епіскапа, а з 1600 г. і уніяцкага мітрапаліта, Пацей ажыццявіў праект уніі Праваслаўнай Царквы ВКЛ і Каталіцкага Касцёла.

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ

- У 1595 г. І. Пацей, маючы на мэце прыцягнуць да справы уніі як мага больш прыхільнікаў, піша і выдае ў Вільні твор «Унія, або Выклад галоўных артыкулаў лучнасці грэкаў з Касцёлам Рымскім» (1595), які меў велізарнае значэнне для абгрунтавання канцэпцыі аб'яднання цэркваў.
- Дастаткова адзначыць, што аўтар «Уніі» ўпершыню ў славянскай літаратуры загаварыў не пра адрозненні Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла, а аб тым, што іх аб'ядноўвае, падкрэсліваючы агульнае паміж дзвюма важнейшымі плынямі хрысціянства.
- Твор І. Пацея «Унія» паклаў пачатак

# ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ

- Уніяцкі мітрапаліт у змаганні са сваімі ідэйнымі апанентамі аддаваў перавагу пяру і слову.
- У 1597 г. у Вільні Пацей піша «Справядлівае апісанне Берасцейскага сабора», якое з'яўлялася разгорнутым адказам на «Апокрысіс» Х. Філалета.
- На старонках твора пісьменнік аргументавана паказваў, што падпісанне уніі не супярэчыла царкоўнаму праву і свецкім законам Вялікага княства Літоўскага і адбывалася належным чынам, а сабор праводзіўся ў адпаведнасці з даўнімі традыцыямі.

# СПРАВЯДЛІВАЕ АПІСАННЕ ЎЧЫНКУ І СПРАВЫ СІНОДАВАЙ І АБАРОНА ЗДЗЕЙСНЕНЫХ ЗГОДЫ Й ЛУЧНАСЦІ, ЯКІЯ СТАЛІСЯ НА СІНОДЗЕ БЕРАСЦЕЙСКІМ У 1596 ГОДЗЕ

**Цытаты:**

Не думалі, каб тая справа згоды і міласці хрысціянскай, якая нядаўна сталася паміж Рымскім Касцёлам і Грэцкаю Царквою ў панстве яго каралеўскай міласці, пана нашага міласцівага, патрабавала якое ўхвалы ці абароны, бо кожны хрысціянін добра ведае, як Ісус Хрыстос, Збаўца наш, шанаваў згоду і міласць у Евангеллі сваім святым. За асаблівы знак, па якім яго верныя пазнаюцца, лічыў акурат згоду і міласць хрысціянскую. А не штосьці іншае. З гэтага вынікае: хто іх шануе і прагне — той ад Бога і можа звацца сапраўдным вучнем Ісуса Хрыста, а хто бегае ад згоды і міласці хрысціянскае, бурыць яе — таго можна называць сынам Д’ябла і ерэтыком.

## СПРАВЯДЛІВАЕ АПІСАННЕ ЎЧЫНКУ І СПРАВЫ СІНОДАВАЙ І АБАРОНА ЗДЗЕЙСНЕНЫХ ЗГОДЫ Й ЛУЧНАСЦІ, ЯКІЯ СТАЛІСЯ НА СІНОДЗЕ БЕРАСЦЕЙСКІМ У 1596 ГОДЗЕ

**Цытаты:**

Здалося мне слушным, дзеля поўнай вядомасці ўсіх, тую справу, якую добра ведаю і на якую ўласнымі вачыма глядзеў, коратка занатаваць і выдрукаваць. Каб неабазнаныя людзі ўбачылі шчырую праўду і больш хлусні не ўспрымалі, плётак не слухалі і не дазвалялі рассяваць у сваім асроддзі яўнага падману, што ёсць абразаю для Бога і непрыстойным аслаўленнем святаблівага і ласкавага бацькоўскага панавання яго каралеўскай міласці. Прыступаю тады да аповеду, як пад панаваннем яго быццам бы хрысціянскім вольнасцям якісьці гвалт чыніцца.

# Пятро СКАРГА



- **Сапраўднае імя – Пётр Павенскі;**
- **пісьменнік, філосаф, багаслоў, царкоўны і палітычны дзеяч;**
- **Гады жыцця:**

  **1536 -1612**

# Пятро СКАРГА

## Біяграфія:

- Нарадзіўся ў Польшчы,
- скончыў Кракаўскую акадэмію,
- вучыўся ў Рыме.
- З 1574 года ў ВКЛ.
- Езуіт, заснавальнік і першы рэктар (1579–1584 гг.) Віленскай езуіцкай акадэміі,
- адзін з ініцыятараў Брэсцкай царкоўнай уніі.
- на працягу апошніх 24 гадоў свайго жыцця займаў пасаду *прыдворнага* прапаведніка пры двары караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы.
- Пасада абавязвала перад адкрыццём сеймаў Рэчы Паспалітай выступаць з *казаннямі (прамовамі рэлігійна-павучальнага характару, пропаведзямі)* ў прысутнасці караля, сенатараў і дэпутатаў.

# Пятро СКАРГА

## Аўтар твораў:

- «Пра еднасць Божай царквы» (1577 г.);
- «Брэсцкі сінод» (1597 г.);
- *«Сеймавыя казанні»* (1600 г.); Гл. стар. 57–69. Сер.: Залатая калекцыя бел.літ.
- «На трэны і лямант Тэафіла Арталога» (1610 г.) і інш.

# Пятро СКАРГА

## Погляды:

- **Пропаведзі Скаргі былі выдадзены асобнай кнігай пад назвай *«Сеймавыя казанні».***
- **Большасць з іх палеміст прысвяціў *слабасці* каралеўскай улады Рэчы Паспалітай.**
- **Выступаў за моцную *цэнтралізаваную* дзяржаву на чале з каралём, але ўлада караля павінна *абмяжоўвацца* правам і Радай.**
- **У дзяржаўным уладкаванні важнае месца адводзіў *праву*, якое не дасць вырадзіцца каралеўскай уладзе ў тыранію.**
- **Рэзка крытыкаваў анархізм і разбэшчанасць шляхты, выступаў за рэформы дзяржаўнага ладу, папярэджваў, што прамаруджванне з рэформамі па цэнтралізацыі дзяржавы можа прывесці да *падзення* Рэчы Паспалітай.**

# Пятро СКАРГА

## Погляды:

- Палітычным ідэалам лічыў *тэакратыю* (ад грэч. theos – Бог, kratos – улада), пад якой разумелася вяршэнства духоўнай улады над свецкай.
- Абгрунтоўваў неабходнасць *царкоўнай уніі* як спосаба ўмацавання духоўнага адзінства і стабільнасці Рэчы Паспалітай.
- Лічыў, што толькі вучэнне каталіцкай царквы верна служыць грамадству і дзяржаве, іншыя рэлігійныя канфесіі вядуць разбуральныя дзеянні.
- Заклікаў свецкую ўладу прызнаць адзінай пануючай рэлігіяй *каталіцкую,* а ўсе іншыя выкараніць.
- Яго *абураў* прынцып *верацярпімасці,* узаконены ў Рэчы Паспалітай Варшаўскім актам канфедэрацыі 1573 года, а затым замацаваны ў Статуце ВКЛ 1588 г.
- Падтрымліваў правамернасць і мэтазгоднасць існуючай іерархічнай структуры феадальнага грамадства, у якой кожнаму саслоўю адводзілася адпаведная ступень.

# Пятро СКАРГА

- Вялікую ідэалагічную ролю ў палемічным працэсе адыграў трактат П.Скаргі «Аб адзінстве царквы божай і аб грэчаскім ад гэтага адзінства адступленні» (1577), які абгрунтаваў каталіцкі варыянт уніі.
- У прыватнасці, Скарга гаворыць, што трэба прыйсці да згоды, да рашэнняў Фларэнтыйскага сабору, адкінуць тыя ўмовы, па якіх праваслаўны свет не хоча уніі.
- На яго думку – гэта зрабіць лёгка, бо гэтыя ўмовы вельмі дробязныя і іх можна не ўлічваць. Гаворка ідзе пра неабходнасць каталізацыі насельніцтва ВКЛ праз прычыну «шкоднасці» праваслаўя.

# Пятро СКАРГА

- У 1577 годзе *Пётр Скарга* ў Вільні выдаў кнігу *«Аб адзінстве царквы божай...»,* у якой адстойваў ідэю, што царкоўная ўнія ўмацуе дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага, створыць умовы для развіцця ў Вялікім княстве навукі і асветы для народа.
- Сучасныя даследчыкі (І.У. Вішнеўская) слушна адзначаюць, што праграма Скаргі была скіравана *не на незалежную* ўніяцкую царкву, а на паступовае *падпарадкаванне* праваслаўнай царквы

## “Сеймавыя казанні, казанне другое пра любоў да айчыны і пра першую хваробу...”

**Цытаты:**

**“Як нашыя целы паміраюць ці ад унутраных хвароб, ці ад нечаканых здарэнняў, так і каралеўствы маюць свае ўнутраныя хваробы, праз якія занепадаюць. Маюць таксама моцных непрыяцеляў, якія губяць іх войнамі і разбоем.”**

# “Сеймавыя казанні, казанне другое пра любоў да айчыны і пра першую хваробу...”

**Цытаты:**

- “Першая хвароба людская непрыязнасць да ўсеагульнага дабра і хцівасць унутранай спажывы”.
- “Госпад Бог узнёс вас на высокія пасады не дзеля вас саміх, каб пільнавалі свайго спажытку, а дзеля людзей, якіх даверыў вам Госпад Бог, каб пралівалі на нас справядлівасць і супакой, які вам Госпад Бог пасылае”.

# Язэп РУЦКІ




- Сапраўднае імя – Іван Вельямін Руцкі;
- пісьменнік-палеміст, філосаф, педагог, тэолаг, трэці уніяцкі мітрапаліт ;
- Гады жыцця:

  1574 -1637;
- Месца нараджэння:

  родавы маёнтак Рута (таму Руцкі), паблізу Наваградка, у шляхецкай сям'і.

# Біяграфічныя звесткі

- Бацькі належалі да кальвінскага веравызнання.
- Пачатковую адукацыю атрымаў у першай палове 80-х гадоў у наваградскіх анабаптыстаў.
- Адукацыю працягнуў у Віленскай кальвінскай школе, дзе некалькі год старанна вывучаў класічныя мовы — латынь, грэчаскую і іўрыт.
- У 16-гадовым узросце Руцкі накіроўваецца за мяжу: слухае лекцыі ў Пражскім універсітэце, затым заканчвае Вюрцбурскі універсітэт (Нямеччына).

# Біяграфічныя звесткі

- Адданая кальвінізму маці, дачуўшыся пра сімпатыі сына да каталіцтва, пазбавіла яго ўсялякіх сродкаў да існавання.
- Пракуратар велікакняскай і польскай каталіцкіх правінцыяў айцец Бокса параіў юнаку ехаць у Рым і паступіць у Грэчаскі калегіум, дзе багаслоўскую адукацыю можна было атрымаць бясплатна.
- Руцкі так і зрабіў – каля 1600 г. быў залічаны ў Грэчаскі калегіум у Рыме. Тады ж урачыста пакляўся заўсёды трымацца ўсходняга веравызнання, што было адной з умоваў прыняцця ў калегіум.

# Біяграфічныя звесткі

- Дзесьці ў 1601 г. Руцкі вярнуўся ў ВКЛ.
- У 1602 г. памёр рэктар Віленскай уніяцкай семінарыі і І.Пацей згадзіўся прызначыць Я. Руцкага кіраўніком навучальнай установы.
- На пасадзе рэктара, якую Я.Руцкі займаў тры гады, выявіўся яго бліскучы педагагічны талент і здольнасці рэфарматара.

# Біяграфічныя звесткі

- **1607 г.:** у Вільні Руцкі зблізіўся з манахам Свята-Траецкага манастыра Я.Кунцэвічам і пад ягоным уплывам у верасні падаўся ва ўніяцкі манастыр, дзе па сканчэнні тэрміна выпрабавання быў пастрыжаны ў манахі пад імем ***Язэпа***.
- **У ліпені 1608 г. І. Пацей прызначыў Я.Руцкага сваім намеснікам.**
- Па смерці уніяцкага мітрапаліта І. Пацея **(1613 г.)** Жыгімонт Ваза выдаў прывілей, паводле якога новым уніяцкім мітрапалітам прызначаўся Я.Руцкі.

# Біяграфічныя звесткі

- Стаўшы ўніяцкім мітрапалітам, Руцкі разгарнуў дзейнасць па ажыццяўленні сваіх ідэй, якія выклаў у трактаце *«Разважанні нейкага русіна аб выпраўленні ладу грэчаскага абраду»* (1605 г.).
- Бачачы заняпад праваслаўнай царквы ў ВКЛ, ён выношваў ідэю яе *перабудовы* на прынцыпах уніяцтва.
- Руцкі прапаноўваў надаць уніяцкай царкве статус *дзяржаўнай*, у Вялікім княстве ўвесці *ўніяцкае патрыяршаства*, надаць *каралю* Рэчы Паспалітай права прызначаць уніяцкіх епіскапаў.
- Ідэі Руцкага разыходзіліся з *дактрынай* касцёла, якая прызнавала *вяршэнства* духоўнай улады над свецкай; толькі рымскі папа мог прызначаць ці вызваляць ад пасады духоўных асобаў, кіраваць царквою, а не

# Біяграфічныя звесткі

- Руцкі стварыў і ўзначаліў у ВКЛ уніяцкі *ордэн Святого Базыля* (Васіля Вялікага) (1623 г.).
- Ордэн арганізаваў на Беларусі і Літве сетку сваіх манастыроў і школ, якія шмат у чым ствараліся на ўзор езуіцкіх.
- Школу базыльянскага ордэна прайшлі іерархі ўніяцкай царквы, многія дзеячы навукі і культуры Беларусі, у тым ліку і Сімяон Полацкі.
- Даследчыкі *ролю* базыльянскага ордэна ў гісторыі ўніяцкай царквы ў ВКЛ справядліва *параўноўвалі* з роляй ордэна *езуітаў* ва ўмацаванні ў ВКЛ ідэй *каталіцызму*.

# Біяграфічныя звесткі

- Абсалютнаму трыумфу уніяцтва на абшарах ВКЛ перашкодзіла ўзнаўленне ў 1620 г. Іерусалімскім патрыярхам Феафанам праваслаўнай мітраполіі.
- У 1621 г. Я.Руцкі распачаў літаратурную палеміку з праваслаўнымі. Ён апублікаваў два публіцыстычна-палемічныя трактаты — «Падвойная віна» (1621) і «Экзамен абароны» (1621).
- Літаратурныя дыскусіі не знялі ўсіх пытанняў. Мітрапаліту давялося наладжваць дачыненні з Праваслаўнай царквой.
- На старонках сваіх твораў ён закранаў актуальныя праблемы тагачаснага грамадскага і царкоўнага жыцця, прапаноўваў іх

# “Падвойная віна”

**Цытаты:**

- *"Пытаецце, якая карысць з тае еднасці?”*
- “Адказваю. Збавенне душам, якое без яе не можа быць. «Адзін Бог, адна вера, адзін крыж» (Эфес. 4), — кажа апостал. Таму і адна царква мусіць быць. Іншых, зямных даброцяў у той справе і не шукаем, і наагул, вялікая заслуга быць у пашане Пана Бога. Не чакаем узнагароды за працу рук нашых ад тых людзей, дзеля якіх працуем. Але й няўдзячнасць, зласлоўе, дзякуючы Божай помачы, у той справе нас не спалохае.”

# “Падвойная віна”

**Цытаты:**

***"Тыя прыкрасці паміж намі, людзьмі адзінага народа (iednego narodu) і набажэнства, не гвалтоўным і бяздумным наступленнем на нас, як цяпер, не трыбунальскімі, не сеймікавымі, не соймавымі пастановамі, як заклікае Верыфікатар, галасамі і дамаганнем тых ды іншых канстытуцыяў, бо тыя сродкі дагэтуль толькі ўзмацнялі варажнечу. Але толькі з’ехаўшыся ў адзінае месца, і зносінамі супольнымі ў міласці братэрскай, маючы перад вачыма толькі Пана Бога і яго праўду, супакоіцца патрэбна.”***